# ВЕСЬ ТЫДЗЕНЬ БЫЎ САПРАЎДНЫМ СВЯТАМ

**МАСТЫ. У межах Тыдня роднай мовы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса, публіцыст Тамара Мазур выступіла ў раённым цэнтры перад вучнямі адной з гарадскіх школ. Сустрэча з сучаснай айчыннай пісьменніцай стала яркай падзеяй з вялікага шэрагу тэматычных мерапрыемстваў.**

Сярэдняя школа № 2 г. Масты рыхтавалася да Міжнароднага дня роднай мовы загадзя. У выніку кожны клас, кожны вучань прыняў удзел у шэрагу цікавых і карысных мерапрыемстваў, якія праходзілі пяць дзён, з 19 па 23 лютага пад агульнай назвай «Тыдзень роднай мовы».

Падчас акцыі «Размаўляй са мной па-беларуску» шасцікласнікі і дзевяцікласнікі прэзентавалі самаробныя беларускія паштоўкі са словамі любові да роднай мовы і ўдзячнасці продкам за моўны скарб. Вучні чацвёртага беларускамоўнага класа далі старт стварэнню інтэрактыўнага воблака «Маё любімае слова па-беларуску». З дапамогай інфармацыйных тэхналогій яго дапоўнілі сямікласнікі. Пяцікласнікі вызначыліся ў флаер-фэсце «Мой родны кут, як ты мне мілы», а вучні дзявятых і дзясятых класаў паўдзельнічалі ў акцыі «Чытаем Максіма Танка разам». У школьным музеі былі арганізаваныя тэматычныя экскусіі, а ў бібліятэцы – выстава беларускіх кніг і пазлаў з унікальнымі словамі на роднай мове. Знайшоўся час для захапляльнай квэст-гульні «Фальклор, фальклор – душа народа», гастранамічнага фэста «Беларуская кухня» і іншых класных і міжкласных захапляльных мерапрыемстваў.

Сярод іх школьнікам запомніцца сустрэча з беларускай паэтэсай, членам савета Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамарай Мазур. Госця прадставіла слайды са сваім вершам «Дыялог пра мову», аздобленыя анімэ. Данесці сэнс твора да глядацкай аўдыторыі дапамаглі Яўген Добры і Герман Мыснік – вучні настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Таццяны Яўгенаўны Калеснікавай. Хлопчыкі выдатна сыгралі ролі двух суразмоўцаў Сцяпана і Івана і з удзячнасцю прынялі ад аўтара па экзэмпляру яе новага паэтычнага зборніка «Васількі на світанні».

Можна было б на гэтым паставіць кропку, але школьнікі папрасілі госцю расказаць пра свой творчы шлях. І ў выніку даведаліся шмат цікавага не толькі пра тое, як ствараюцца творы на роднай мове, але і пра гісторыю беларускага друку «з першых вуснаў». Гледачы ўбачылі на экране граматы ад газеты «Піянер Беларусі» і часопіса «Бярозка» за першыя публікацыі Тамары Мазур (тады Баўтрукевіч), вялікую наборную машыну (лінатып), за якой з 17 гадоў працавала будучая пісьменніца ў Гродзенскай абласной друкарні. Затым Тамара Міхайлаўна распавяла пра сакрэты «кніжнага буму» напрыканцы 80-х гадоў, калі яна была загадчыцай кнігарні, і,

нарэшце, пра сваю вучобу ў ВНУ і журналісцкую працу ў розных выданнях, якая вымяраецца шляхам у 30 гадоў.

На прыкладзе жыцця шаноўнай госці слухачы пераканаліся ў тым, што варта шукаць і знайсці сваё месца там, дзе нарадзіліся, а таксама даведаліся пра карысць валодання роднай мовай – мовай свайго роду.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** член СПБ, паэтэса Тамара Мазур ля слайдавай прэзентацыі верша «Дыялог пра мову». Пісьменніца падарыла свае кнігі Яўгену Добраму і Герману Мысніку за выкананыя ролі герояў твора. Тамара Мазур з настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Таццянай Калеснікавай. Удзячныя слухачы. Горад Масты, сярэдняя школа № 2 імя Героя Савецкага Саюза Васіля Пятровіча Жукава, Гродзенская вобласць. Люты 2025 года.




ЕНЬ
РОДНА
ВЫ
З НАДЫХОДЗЯЧЫМ СВЯТАМ
мова – твой генетычны ко
– Тамара МАЗУР,
а пісьменнікаў Беларусі.


ДЗЕНЬ
РОДНАЙ
МОВЫ


КЛАСНЫ КУТОК